Т.І.Жышкевіч,
ст.выкладчык Беларускага універсітэта культуры

# РОЛЯ ПРАКТЫКІ ВА ЎДАСКАНАЛЕННІ МУЗЫЧНАГА СЛЫХУ ІНСТРУМЕНТАЛІСТА-ВЫКАНАЎЦЫ

Прафесійная дзейнасць прад'яўляе да сучаснага музыканта высокія патрабаванні. У сістэме вышэйшай музычнай адукацыі побач з прадметамі тэарэтычнага і гістарычнага цыклаў, спецпрадметамі па ўдасканаленні інструментальнага выканальніцтва пэўная колькасць гадзін адводзіцца педагагічнай практыцы. Вучэбны план студэнтаў кафедры народна-інструментальнай творчасці прадугледжвае праходжанне гэтага курса ў VII — IX семестрах з разліку 1 — 2 гадзіны ў тыдзень па спецыяльна распрацаваных праграмах, якія ўлічваюць узровень прафесійных ведаў і ступень гатоўнасці вучняў да самастойнай працы ў якасці настаўніка спецінструмента. Педагагічная практыка — адно з важнейшых звёнаў у працэсе навучання прафесійных музыкантаў.

Выпускнікі кафедры працуюць выкладчыкамі музычных інструментаў у дзіцячых музычных школах і студыях, вучылішчах культуры і музычных вучылішчах, ліцэях, каледжах; кіруюць самадзейнымі і прафесійнымі аркестравымі калектывамі, працуюць музычнымі рэдактарамі ў тэатрах, на радыё і тэлебачанні, мастацкімі кіраўнікамі Палацаў і Дамоў культуры, гукаапературамі ў студыях гуказапісу, канцэртмайстрамі харавых і танцавальных гурткоў і інш. Кожны від дзейнасці мае сваю спецыфіку, свае асаблівасці, але любая са сфер прыкладання творчых намаганняў музыканта-прафесіянала ва ўмовах сучаснага культурнага кантэксту патрабуе абавязковай наяўнасці адмысловага, актыўнага і высокаразвітага музычнага слыху.

Прафесійны музычны слых мае складаную шматкампанентную структуру. Падмуркам яе з'яўляюцца музычныя здольнасці чалавека сенсорнага ўзроўню: тэмбравы слых,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гукавысотны слых, рытмічны слых (пачуццё рытму), памяць. У працэсе засваення музычна-інтанацыйнага комплексу і мэтанакіраванага спецыяльнага навучання атрымліваюць істотнае развіццё кампаненты наступнага, эмацыянальна-семантычнага ўзроўню: меладычны, гарманічны і поліфанічны слых, а таксама кампаненты вышэйшага мастацкага ўзроўню, гэтак званага інтэгратыўна-семантычнага: пачуццё формы або архітэктанічны слых. Выкананне музычнага твору, увасабленне задумы кампазітара, стварэнне пераканаўчага мастацкага вобраза немагчымыя без якасна сфарміраванага музычнага слыху. Вывучэнне шырокага кола тэарэтычных дысцыплін, назапашванне ўласнага выканальніцкага вопыту работы над музычным творам у класах спецінструмента па сучасных праграмах забяспечваюць інтэнсіўнае развіццё ўсіх узроўняў музычнага слыху. Але дачыненне студэнта да практыкі выкладчыцкай працы даволі значна актывізуе яго слыхавыя здольнасці, стымулюе мабільнасць музычна-ацэначнай дзейнасці.

Педагагічная практыка прадугледжвае знаёмства студэнта-практыканта з усім спектрам работы навучальнай установы. Поруч з засваеннем вучэбна-выхаваўчага працэсу, структуры арганізацыйнай, метадычнай, навуковай работы практыка дае магчымасць непасрэдна працаваць у якасці настаўніка. Работа над музычным творам — галоўнае звяно, у якім факусіруюцца ўсе набытыя на працягу навучання тэарэтычныя веды, уласны выканальніцкі вопыт, у якім праяўляецца ступень развіцця і прафесійнай аснашчанасці музычнага слыху. Педагагічная практыка выконвае вялікую ролю ва ўдасканаленні і актывізацыі музычнага слыху, у інтэнсіфікацыі музычна-ацэначнай дзейнасці студэнта. У працэсе работы з вучнем студэнт павінен адэкватна і самастойна ацаніць музычны матэрыял, зыходзячы са склаўшыхся ў перыяд асабістага навучання мастацкіх арыенціраў. Фарміруюцца якасныя крытэрыі музычна-ацэначнай дзейнасці і алгарытм прафесійных педагагічных дзеянняў студэнта. Яго можна падаць у наступным выглядзе:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Самастойны слыхавы аналіз і ацэнка выканання, ідэнтыфікацыя гукавога матэрыялу і спосабаў увасаблення на адпаведнасць гукавому ідэалу.

2. Вызначэнне ступені значнасці і паслядоўнасці канкрэтных, цалкам даступных на дадзены момант задач па ўдасканаленні выканання ў залежнасці ад індывідуальных інтэлектуальных магчымасцей і творчых здольнасцей вучня.

3. Выбіранне найбольш мэтанакіраваных і эфектыўных прыёмаў для рэалізацыі тэхнічнай задачы, не губляючы пры гэтым адчування дзейснага творчага працэсу, мастацкага кантэксту твора.

4. Фармуляванне простымі словамі чарговай мэты, наступнага дзеяння выканаўцы. Студэнт-практыкант упершыню сустракаецца з падобнай задачай. Самастойнае вырашэнне яе фарміруе ўменне актыўна слухаць і ўсведамляць, кваліфікавана ацэньваць выкананне і пераканаўча абгрунтоўваць вучню логіку трактоўкі музычнай кампазіцыі ў славеснай форме.

5. Рэалізацыя мастацкай ці тэхнічнай задачы пры дапамозе паказу або славеснага тлумачэння.

6. Удасканальванне наступных дзеянняў на падставе атрыманага выніку, пільнага і ўважлівага слыхавага аналізу музыкі, якая прагучала. Вызначэнне чарговай мастацкай або тэхнічнай задачы з улікам змяненняў у выкананні, якія адбыліся.

Вядома, што работа над музычным творам ідзе павольна. Таму гэты алгарытм шматразова паўтараецца на працягу урока, такім чынам слых студэнта-практыканта напружана, інтэнсіўна дзейнічае. Педагагічная практыка дазваляе студэнту скарыстаць вядомыя яму прыёмы і метады індывідуальнага падыходу да працэсу работы над музычным творам і ажыццявіць асабісты творчы пошук шляхоў укаранення інавацый у галіне музычна-педагагічнай дзейнасці. У канкрэтнай рабоце з вучнем над п'есай адбываецца фарміраванне механізму эфектыўнага ўжывання атрыманых ведаў і ўменняў, назапашваецца педагагічны вопыт,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

удасканальваюцца педагагічныя навыкі. Трэба адзначыць важнасць самастойнага аналізу студэнтам-практыкантам вучнёўскага выканання без звыклага чакання ацэнкі гукавога матэрыялу педагогам па спецінструменце, што даволі шырока распаўсюджана ў вучэбным выканальніцкім вопыце студэнтаў. Метад "нацягвання" ў інструментальных класах спецыяльных вучэбных устаноў, нягледзячы на шматгадовае нязменнае ганьбаванне, існуе і параджае ў выканаўцы ўтрыманскія ўстаноўкі ў сферы музычна-ацэначнай дзейнасці. Самастойнае і адказнае прыняцце рашэнняў па ўдасканаленні выканання музычнага твора стварае ўмовы для інтэнсіфікацыі аналізу слыхавых уражанняў і дыферэнцыяцыі асобных састаўных элементаў музычнай тканіны, уменне вызначыць галоўнае і другаснае. Атрыманы падчас педагагічнай практыкі вопыт актыўнага слыхавога аналізу выканання інструменатальнай п'есы вучнем замацоўваецца ва ўсведамленні студэнта. І ў далейшым гэты навык дзейнічае ў ацэнцы ўласнага выканання, стымулюе асэнсаваную інтэлектуальную работу з гукавым матэрыялам музычнага твору.

Падобная дзейнасць надзвычай складаная, і таму першыя самастойныя крокі на шляху прафесійнага выкладчыка абавязкова кантралююцца кіраўніком педагагічнай практыкі, як правіла, вопытным выкладчыкам, роля якога зводзіцца да дэталёвага разбору ўрока, метадычных парад і маральнай падтрымкі студэнта. За час педагагічнай практыкі выпрабоўваюцца псіхалагічная і прафесійная прыдатнасць студэнта да выбранай спецыяльнасці. Прадстаўляецца мэтазгодным арганізаваць разбор кожнага самастойнага ўрока практыканта адразу пасля яго заканчэння. Работа над музычным творам з вучнем безумоўна павінна быць паслядоўнай: ад знаёмства з нотным тэкстам да канчатковага эстраднага выканання, цэласнага мастацкага ўвасаблення. Такім чынам, заняткі з вучнем трэба праводзіць па раскладу музычнай установы, звычайна 2 гадзіны ў тыдзень. Усяго атрымліваецца 4 гадзіны ў тыдзень: два разы па 2 гадзіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ